# АПАКАЛІПТЫЧНЫ ДЫСКУРС РАННЯГА ХРЫСЦІЯНСТВА: МІФАЛАГІЧНАЯ МОВА І ГІСТАРЫЧНЫ ЗМЕСТ

**А. У. Дуброўскі**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 99, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*dubrovski@list.ru*

У артыкуле разглядаюцца сучасныя падыходы да інтэрпрэтацыі апакаліптычных тэкстаў Новага Запавету. На працягу доўгага часу існавала тэндэнцыя разумець іх як літаральнае прадказанне «канца свету». Але сучасныя даследчыкі (Н. Т. Райт, Г. ДэМар і інш.) сцвярджаюць, што ў адпаведных тэкстах вобразы касмічнай катастрофы выкарыстоўваюцца ў якасці метафар для апісання сацыяльна-палітычных катаклізмаў тагачаснай рэальнасці. Менавіта гэтыя катаклізмы з'яўляюцца гістарычным зместам апакаліптычнай літаратуры, якая карыстаецца мовай міфа. Для правільнага разумення зместу біблейскіх апакаліптычных тэкстаў трэба разумець культурны досвед першых чытачоў і «псіхалогію жанру». Увесь сэнс апакаліптыкі – у гістарычнай прывязцы да канкрэтных катаклізмаў, відавочцамі якіх былі і аўтар, і чытачы.

***Ключавыя словы***: апакаліптыка; міфалагема; жанр; метафара; дэміфалагізацыя; гісторыя.

# АПОКАЛИПТИЧЕСКИЙ ДИСКУРС РАННЕГО ХРИСТИАНСТВА: МИФОЛОГИЧЕСКИЙ ЯЗЫК И ИСТОРИЧЕСКОЕ СОДЕРЖАНИЕ

**А. В. Дубровский**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный аграрный технический университет,*
*пр-т Независимости, 99, 220012, г. Минск, Республика Беларусь,*
*dubrovski@list.ru*

В статье рассматриваются современные подходы к толкованию апокалиптических текстов Нового Завета. Долгое время существовала тенденция понимать их как буквальное предсказание «конца света». Однако современные исследователи (Н. Т. Райт, Г. ДеМар и др.) утверждают, что в соответствующих текстах образы космической катастрофы используются как метафоры для описания социально-политических катаклизмов того времени. Именно эти катаклизмы составляют историческое содержание апокалиптической литературы, использующей язык мифа. Чтобы правильно понять содержание библейских апокалиптических текстов, необходимо понимать культурный опыт первых читателей и «психологию жанра». Весь смысл апокалиптики заключается в ее исторической связи с конкретными катаклизмами, свидетелями которых стали и автор, и читатели.

***Ключевые слова***: апокалиптика; мифологема; жанр; метафора; демифологизация; история.

# APOCALYPTIC DISCOURSE OF EARLY CHRISTIANITY: MYTHOLOGICAL LANGUAGE AND HISTORICAL CONTENT

**A. U. Dubrouski**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State Agrarian Technical University,*
*99 Independence Avenue, 220012, Minsk, Republic of Belarus,*
*dubrovski@list.ru*

The article is devoted to modern approaches to the interpretation of apocalyptic texts of the New Testament. For a long time, there was a tendency to understand them as a literal prediction of the «end of the world». However, modern researchers (N. T. Wright, G. DeMar, and others) argue that in the corresponding texts, images of a cosmic catastrophe are used as metaphors to describe the socio-political cataclysms of that time. It is these cataclysms that constitute the historical content of apocalyptic literature using the language of myth. In order to correctly understand the content of biblical apocalyptic texts, it is necessary to understand the cultural experience of the first readers and the «psychology of the genre». The whole meaning of apocalypticism lies in its historical connection with specific cataclysms, which both the author and the readers witnessed.

***Keywords***: apocalyptic; mythologem; genre; metaphor; demythologization; history.

У гісторыі чытацкага ўспрымання літаратурных твораў існуе наступны парадокс. Сучаснаму чытачу здаецца, што чытач старажытны павінен быў успрымаць старажытныя тэксты максімальна наіўна і літаральна. Але пры звароце да канкрэтных прыкладаў аказваецца, што менавіта сучасныя чытачы дэманструюць наіўнасць. У прыватнасці, не распазнаюць метафару ў якасці метафары, сімвал у якасці сімвала і г. д. Тое, што было для старажытнага чытача прывычнай вобразнай мовай, а старажытнымі аўтарамі выкарыстоўвалася ў якасці гатовага набору прывычных выяўленчых сродкаў, сучасным чытачом успрымаецца вельмі літаральна. Звернемся да апакаліптычнай вобразнасці, каб прадэманстраваць гэта, а канкрэтна – да таго дзіўнага факту, які заключаецца ў тым, што для нашага сучасніка ўвесь змест біблейскай апакаліптыкі звёўся да канцэпту «канца свету», які, як паказваюць найноўшыя даследаванні, зусім не адпавядае ні ўнутранай логіцы новазапаветных тэкстаў, ні іх літаратурнаму і гістарычнаму кантэксту.

Аляксандр Мень разумеў апакаліптыку як жанр біблейскага і апакрыфічнага пісьменства, прысвечаны метагісторыі, або тайнам боскай волі і наканавання, якія выяўляюцца ў гістарычных падзеях [гл. 1, с. 78]. Пад метагісторыяй разумеецца будучае жыццё ў Царстве Божым, хаця такое разуменне здаецца спрошчаным. Разам з тым яно яўна ўводзіць нас

у сферу міфалогіі, мова якой аказваецца цалкам арганічнай для выражэння адпаведнага метагістарычнага зместу. А. Мень справядліва заўважае, што «аўтары Пісання не гавораць пра найвышэйшыя ісціны абстрактнай мовай. Іх мова насычаная сімвалізмам, нагляднасцю; яны малююць “карціну” там, дзе рацыянальныя веды бяссільныя. Такімі ёсць апавяданні першых раздзелаў Кнігі Быцця і апакаліптычныя кнігі» [2, с. 210 – 211]. Гэтая заўвага важная тым, што паказвае: міфалогія робіцца мовай там, дзе трэба гаварыць пра тое, што «знаходзіцца» да гісторыі і пасля гісторыі, да часу і пасля часу. Але далей ён працягвае і кажа яшчэ больш важныя рэчы: «Даведзенае ў гэтай форме Адкрыццё не толькі знаходзіць у міфе сімволіку для таго, што нельга выразіць абстрактна, яно захоплівае ўсю існасць чалавека, а не толькі яго думку. За біблейскімі міфалагемамі стаяць рэальнасці: у адных выпадках – містыка-анталагічныя, а ў іншых – і канкрэтна-гістарычныя» [2, с. 211]. Апошняя фраза найбольш важная для нашай тэмы. Звядзенне новазапаветнай апакаліптыкі да «канца свету» з’яўляецца адначасова і вынікам і прычынай таго, што гэтыя канкрэтна-гістарычныя рэаліі, адлюстраваныя ў тэксце, поўнасцю ігнаруюцца ўвагай чытача, не заўважаюцца ім.

Нагадаем, што ў Новым Запавеце да апакаліптыкі належаць так званы малы апакаліпсіс Евангелляў (Мф 24; Мк 13:3-37; Лк 21:5-36) і Адкрыццё Яна Багаслова.

Пра міф і гісторыю ў Адкрыцці Яна добра піша, на наш погляд, Януарый Іўліеў. З аднаго боку, ён сцвярджае, што вобразы Апакаліпсіса адлюстроўваюць міфалогію сучаснага Яну свету, у тым ліку антычную і вавілонскую [гл. 3, с. 12]. Разам з тым кніга напоўнена мноствам канкрэтна-гістарычных фактаў. Адразу трэба прывесці красамоўны прыклад: знакамітая лічба 666 – зашыфраванае імя імператара Нерона, што з’яўляецца сёння ў біблеістыцы практычна агульнапрынятым пунктам гледжання. Я. Іўліеў падкрэслівае: «Было б вялікай памылкай бачыць у вобразах Адкрыцця пазачасавыя сімвалы. Яны ўзяты з гістарычнага кантэксту і адпавядаюць гістарычнаму кантэксту Апакаліпсіса… Усе яго вобразы і сімвалы трэба зразумець у спецыфічнай сацыяльнай, палітычнай, культурнай і рэлігійнай сітуацыі першых чытачоў кнігі. Толькі зразумеўшы гэтую кнігу ў кантэксце таго часу, мы можам спасцігнуць яе сэнс і значэнне для нашага часу. Вобразы Адкрыцця маюць дачыненне да “рэальнага” свету мінулай эпохі» [3, с. 13].

Але сітуацыя з малым апакаліпсісам Евангелляў уяўляецца яшчэ больш цікавай. Замацавалася традыцыйнае разуменне гэтых тэкстаў як прароцтва пра «канец свету». Кур’ёз у тым, што пры такім разуменне шмат дэталяў становяцца надзвычай нелагічнымі. Напрыклад: «…тыя, хто ў Юдэі, няхай уцякаюць у горы; хто будзе на даху, няхай не спуска-

ецца ў дом узяць нешта з дому свайго; хто будзе на полі, няхай не вяртаецца забраць вопратку сваю. Гора цяжарным і тым, што кормяць грудзьмі ў тыя дні! Маліцеся, каб не здарылася гэта зімой» (Мк 13:14-17). Які сэнс гэтых парад перад абліччам «канца свету», касмічнай катастрофы? Пры гэтым тэкст насычаны такімі дэталямі, якія яўна паказваюць, што гаворка ідзе пра падзеі 70-га года (Іўдзейская вайна, падзенне Іерусаліма, разбурэнне храма).

Падрабязна да гэтай тэмы звяртаецца ў сваіх даследаваннях адзін з найбуйнейшых сучасных біблеістаў Нікалас Томас Райт. Вось да якіх высноў ён прыходзіць: «…няма ніякіх падстаў для вываду пра тое, што апакаліптычны [тэкст] абавязкова гаворыць пра канец свету ў літаральным касмічным сэнсе. <…> У вялізнай масе апакаліптычных пісанняў няма ні намёку на тое, што наш прасторава-часавы сусвет дрэнны, або спадзяванняў на тое, што яму прыйдзе канец. <…> На працягу апошняга [XX] стагоддзя ў навуцы панавала маўклівае перакананне, што: а) вобразы касмічнай катастрофы, у большасці фігуральныя, трэба разумець літаральна; б) відавочныя ў апакаліпсісах дуалістычныя ўяўленні сведчаць пра радыкальны дуалізм, які марыць пра поўнае знішчэнне існага свету. Замест гэтага трэба сцвярджаць такое прачытанне, якое ўважліва ставіцца да літаратурнага жанру адпаведных твораў, не адрывае іх ад гістарычнага кантэксту, у якім большасць іўдзеяў… чакалі ад Бога дзеянняў у рамках гісторыі, і правільна разумее светапогляд і багаслоўе іўдаізму, у якім нармальнай і звычайнай сферай дзеянняў Бога… з’яўляецца менавіта наш цяперашні свет. Літаратура, гісторыя і багаслоўе разам падказваюць нам, што большую частку апакаліптычнай літаратуры, як іўдзейскай, так і хрысціянскай, неабходна чытаць як складаную сістэму метафар, якія насычаюць прасторава-часавую рэальнасць яе поўным, то-бок багаслоўскім значэннем» [4, с. 387–388].

Калі ў малым апакаліпсісе мы сустракаем вобразы «міфалагічнай сусветнай катастрофы» (зацьміцца сонца, месяц не дасць святла, зоркі будуць падаць з неба), то трэба разумець, што гэта гатовыя вобразы апакаліптыкі і няма прычын разумець іх літаральна. Н. Т. Райт называе гэта «дурной літаральнасцю» [5, с. 329]. У яўрэйскай традыцыі такія вобразы адносіліся да апісання сацыяльна-палітычных і ваенных катаклізмаў, і чытачы цудоўна іх разумелі. Іх нельга разумець літаральна «без грубага насілля» ў адносінах логікі тэксту [4, с. 369].

Але чаму пракорі выбіралі менавіта такую мову? Н. Т. Райт адказвае: «Метафарычная мова апакаліптыкі нагружае гісторыю метафізічным сэнсам» [4, с. 369]. У іншай кнізе ён піша: «Падзенне Іерусаліма – у нейкім сэнсе касмічная катастрофа» [5, с. 330]. Верагодна, можна сказаць так: у тагачаснай свядомасці не было ніякага разрыву паміж гісторыяй і

метагісторыяй, не было самога гэтага супрацьпастаўлення. У выніку наша сучаснае прачытанне, калі не будзе гэтага ўлічваць, акажацца і літаральным, і анахранічным. І верагодна, разуменне старажытнага аўтара і старажытнага чытача было больш цэласным і глыбокім.

І тут ёсць сэнс падумаць пра «псіхалогію жанру». Калі ўдумацца, мы прыйдзем да высновы, што апакаліптыка таму і магла існаваць, што нараджалі яе балючыя канкрэтна-гістарычныя праблемы. Немагчыма ўявіць само ўзнікненне гэтых тэкстаў проста як нейкага мастацкага (ці духоўнага) разважання-практыкавання на тэму далёкай будучыні. Увесь сэнс апакаліптыкі – у гістарычнай прывязцы да канкрэтных катаклізмаў, відавочцамі якіх былі і аўтар і чытачы.

Тэме малых апакаліпсісаў прысвечана і кніга Гэры ДэМара [гл. 6], рускі пераклад якой («Войны и военные слухи») выйшаў у Мінску ў 2025 г. Аўтар падрабязна каментуе 24-ы раздзел Евангелля паводле Матфея. ДэМар падкрэслівае, што правільна зразумець малы апакаліпсіс можна толькі ў выпадку разумення той аўдыторыі, якой ён быў адрасаваны – пакаленню, што жыло ў першым стагоддзі; адпаведна, надаецца вялікае значэнне, напрыклад, фразе «не міне род гэты, як усё гэта будзе» (Мф 24:34), якая сапраўды прывязвае ўвесь урывак да гістарычнага кантэксту сучаснікаў Ісуса, у прыватнасці – да падзей 70-га года. І важна падкрэсліць, што як слухачы Ісуса, так і першыя чытачы Евангелля маглі разумець гэта толькі так. Для іх не было праблемай бачыць у вобразах касмічнай катастрофы канкрэтныя рэаліі іх эпохі, і яны яўна не чакалі нейкага «іншага канца свету». Такія чаканні (і такое літаральнае разуменне міфалагічных вобразаў) магло нарадзіцца ў больш познюю эпоху ў іншай чытацкай аўдыторыі, якой падзеі Іўдзейскай вайны ўжо нічога не гаварылі.

Але ці не азначае гэта, што тэзіс Я. Іўліева («толькі зразумеўшы… кнігу ў кантэксце таго часу, мы можам спасцігнуць яе сэнс і значэнне для нашага часу» [3, с. 13]) ператвараецца ў проста прыгожую дэкларацыю? Іншымі словамі, ці азначае ўсё сказанае, што тэкст, прывязаны да канкрэтных гістарычных падзей, губляе сваю актуальнасць для ўсіх будучых пакаленняў, асабліва калі гэта тэкст, які прэтэндуе на духоўную змястоўнасць? Думаецца, што ўся гісторыя культуры яўна абвяргае гэта. У свой час Р. Бультман сфармуляваў праграму дэміфалагізацыі біблейскага паслання [гл. 7]. На жаль, складваецца ўражанне, што сёння недаацэньваюць значэнне працы Р. Бультмана. Той жа Н. Т. Райт ставіцца да яго скептычна. Але менавіта ў святле вывадаў самога Н. Т. Райта падыход Р. Бультмана можа быць пераасэнсаваны і актуалізаваны. Цалкам верагодна, што сёння ёсць сэнс казаць пра дэміфалагізацыю гісторыі. Іншымі словамі, гісторыя не абавязана ператварацца ў міф, яна

можа пераасэнсоўвацца экзістэнцыяльна. Пра гэта мы ў свой час пісалі, прычым менавіта ў дачыненні да падзей 70-га года ў кантэксце новазапаветнага паслання [гл. 8, с. 108–119].

Такім чынам, сучасны чытач, у тым ліку чытач прафесійны, павінен значна больш давяраць чытачу – сучасніку аўтара; мы павінны ставіцца да тагачаснага чытацкага ўспрымання як да абсалютна канкрэтнай катэгорыі, мы павінны ўяўляць гэтае ўспрыманне, калі хочам адэкватна рашаць герменеўтычныя праблемы. Для гісторыка літаратуры важна ўмець глядзець на старажытны тэкст вачыма старажытнага чытача. І ні ў якім разе нельга гэтага чытача недаацэньваць.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Мень А.* Библиологический словарь. М.: Фонд им. Александра Меня, 2002. Т. 1.
2. *Мень А.* Библиологический словарь. М.: Фонд им. Александра Меня, 2002. Т. 2.
3. *Ивлиев И.* И увидел я новое небо и новую землю. Комментарий к Апокалипсису. М.: Изд-во ББИ, 2016.
4. *Райт Н. Т.* Новый Завет и народ Божий. Черкассы: Коллоквиум, 2013.
5. *Райт Н. Т.* Иисус и победа Бога. М.: Изд-во ББИ, 2004.
6. *ДеМар Г.* Войны и военные слухи: что на самом деле говорил Иисус о кончине века, великой скорби и Своем пришествии. Минск: Метанойя, 2025.
7. *Бультман Р.* Избранное. Вера и понимание. М.: РОССПЭН, 2004.
8. *Дубровский А.* Религия, преодолевающая себя. Ирпень: Ассоциация «Духовное возрождение», 2011.